**Абагульнім і запомнім.** У Беларусі функцыянуюць два нафтаперапрацоўчыя заводы — у Наваполацку і Мазыры. Нафта і прыродны газ паступаюць на прадпрыемствы па трубаправодах з Расіі.

1. Назавіце фактары размяшчэння нафтавай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці Беларусі. 2. Якая сыравіна выкарыстоўваецца на нафта- і газаперапрацоўчых прадпрыемствах?

3. Чаму вытворчасць нафтапрадуктаў з'яўляецца важнай крыніцай валютных даходаў краіны? 4. З якімі праблемамі можа сутыкнуцца сучасная нафтаперапрацоўка?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце рэкламны плакат «Прадукцыя НПЗ Беларусі».

## § 33. Геаграфія металургіі

***Узгадваем.*** *Якія віды сыравіны неабходныя для металургічнай вытворчасці?*

**Структура і фактары размяшчэння металургічнай вытворчасці.** У структуры апрацоўчай прамысловасці Беларусі доля металургіі складае 7,4 %. Металургія адыгрывае важную ролю ў эканоміцы. Яна выпускае металы і шырокі асартымент гатовых вырабаў для прамысловасці, сельскай і лясной гаспадаркі, будаўніцтва, тавараў для народнага спажывання (мал. 123). У металургічны комплекс краіны ўваходзяць каля 20 буйных і сярэдніх прадпрыемстваў, якія вырабляюць стальныя трубы, металакорд,

**Металургія**

| Металургічная вытворчасць | Вытворчасць гатовых металічных вырабаў |
|---|---|
| чыгуну і сталі | будаўнічых металічных канструкцый і вырабаў |
| труб, трубаправодаў | радыятараў, катлоў |
| ліццё металаў | метадам парашковай металургіі |
| | іншых гатовых металічных вырабаў (тавараў народнага спажывання, малых архітэктурных формаў, вырабаў з дроту, крапежных вырабаў) |

Мал. 123. Структурная схема металургіі Беларусі

розныя віды дроту. Акрамя таго, больш за 60 арганізацый выпускаюць гатовыя металічныя вырабы — будаўнічыя металаканструкцыі, інструменты, цыстэрны, катлы, радыятары, крапежныя вырабы і інш. Асноўны аб'ём прадукцыі металургіі прадстаўлены сталлю і гатовым пракатам (табл. 5).

*Табліца 5* — Дынаміка вытворчасці асноўных відаў прадукцыі металургіі Беларусі

| Прадукцыя, тыс. т | 2005 | 2010 | 2015 | 2017 |
|---|---|---|---|---|
| Сталь | 2076,0 | 2672,0 | 2577,0 | 2432,6 |
| Гатовы пракат | 1839,0 | 2458,0 | 2392,0 | 2201,0 |
| Стальныя трубы | 108,3 | 183,7 | 212,2 | 236,5 |
| Дрот | 205,0 | 374,6 | 399,5 | 422,8 |
| Металакорд | 78,5 | 92,9 | 87,9 | 94,8 |
| Цвікі, кнопкі, скобы і аналагічныя вырабы | 44,4 | 63,4 | 56,3 | 53,9 |

Беларусь не мае сваёй сыравіннай базы для металургіі. *Якія перспектывы здабычы сыравіны для металургіі ў Беларусі?* Сыравінай для прадпрыемстваў з'яўляюцца чыгунныя і стальныя нарыхтоўкі, мясцовы і прывазны металалом. Штогод выпрабляецца 3,5 млн т чорных металаў, з якіх 70 % складаюць гатовы пракат, трубы, метызы, каля 30 % — чыгуннае і стальное ліццё. Больш за 90 % чыгуннага і стальнога ліцця выпрабляецца ў ліцейных цэхах прадпрыемстваў на аснове перапрацоўкі чыгуну, які завозіцца з-за межаў Беларусі. Для прадпрыемстваў чорнай металургіі прамысловае аб'яднанне «Белдругасчормет» нарыхтоўвае штогод 1,2 млн т лому і адходаў чорных металаў. У пасёлку Гатава каля Мінска створана прадпрыемства «Другасчормет», якое збірае і часткова перапрацоўвае металалом.

**Геаграфія металургічнай вытворчасці.** Найбольшую ўдзельную вагу ў рэгіянальнай структуры металургіі займае Гомельская вобласць. Высокая ўдзельная вага таксама ў Мінскай вобласці і Мінска, дзе размяшчаюцца

ліцейныя і металаапрацоўчыя цэхі машынабудаўнічых заводаў. Доля астатніх рэгіёнаў Беларусі невялікая (мал. 124).




Мал. 124. Рэгіянальная структура металургіі Беларусі, 2017 г., %

Найбуйнейшым прадпрыемствам у краіне з'яўляецца Беларускі металургічны завод у Жлобіне, які быў пабудаваны ў 1984 г. (мал. 125). Тэхналагічны працэс на заводзе просты, узровень аўтаматызацыі высокі, сабекошт вытворчасці металу і металавырабаў нізкі, а якасць прадукцыі высокая. Размяшчэнне БМЗ у Жлобіне тлумачыцца транспартным і водным фактарамі, а таксама наяўнасцю радовішча фармовачных пяскоў. Па праграме імпартазамяшчэння БМЗ наладзіў вытворчасць труб.

Праектная магутнасць 1-й чаргі БМЗ каля 700 тыс. т (500 тыс. т пракату і 200 тыс. т літых нарыхтовак). Зараз выпрацоўваецца 2,5 млн т металу ў год, з якіх 80 % ідзе на экспарт. Як вы думаеце, ці ёсць магчымасць павелічэння вытворчасці на прадпрыемстве?



Мал. 125. Беларускі металургічны завод, г. Жлобін

Буйнейшыя прадпрыемствы металургіі знаходзяцца таксама ў Магілёве, Рэчыцы, Гомелі, Маладзечне, Мінску (мал. 126). Развіццё новай тэхнікі, вытворчасць сучасных машын і механізмаў, неабходнасць павышэння якасці дэталей патрабуюць укаранення новых матэрыялаў. У Беларусі атрымала развіццё парашковая металургія. *Што з'явілася прычынай развіцця парашковай металургіі ў Беларусі?* Зараз у краіне дзейнічае 12 вытворчых участкаў парашковай металургіі, з якіх пяць даюць каля 70 % усяго аб'ёму вытворчасці. Амаль усе гэтыя ўчасткі знаходзяцца ў Мінску. У Маладзечне працуе спецыялізаваны завод. Ён выпускае з жалезнага, меднага парашку і керамікі розныя металічныя вырабы спецыяльнага прызначэння, у асноўным для аўтамабілебудавання.

**Мінск (1)**

**«Белдругасмет»:** нарыхтоўка і перапрацоўка металалому, вытворчасць ліцця з чорных і каляровых металаў і сплаваў
**«БелТЭН»:** вытворчасць трубчастых каркасаў і гнутых дэталей з труб
**Мінскі завод ацяпляльнага абсталявання:** вытворчасць ацяпляльных катлоў, радыятараў

**Маладзечанскі трубапракатны завод (2):** вытворчасць стальных электразварных труб, тавараў народнага спажывання

**Магілёўскі металургічны завод (3):** вытворчасць стальных электразварных профіляў, чыгунных люкаў, тавараў народнага спажывання, малых архітэктурных формаў

**Беларускі металургічны завод (4):** сталеплавільная, пракатная, метызная вытворчасць і вытворчасць труб




1. Мінск
2. Маладзечна
3. Магілёў
4. Жлобін
5. Гомель
6. Рэчыца

**Рэчыцкі метызны завод (6):** вытворчасць крапежных вырабаў (цвікі, шрубы, балты, гайкі, заклёпкі) і дроту

**Гомельскі ліцейны завод «Цэнтраліт» (5):** вытворчасць чыгуннага ліцця, дажджапрымальнікаў, рашотак, мастацкага і пячнога ліцця
**«Гідрапровад» у складзе холдынга «Салеа-Гомель» (5):** чыгуннае ліццё, станочныя вузлы

Мал. 126. Буйнейшыя прадпрыемствы металургічнай вытворчасці Беларусі

**Абагульнім і запомнім.** Асноўная сыравіна для развіцця металургічнай вытворчасці Беларусі — металалом. Найбуйнейшым прадпрыемствам у Беларусі з'яўляецца Беларускі металургічны завод. У Беларусі атрымала развіццё парашковая металургія.

1. Што з'яўляецца сыравінай для металургічнай вытворчасці? 2. Назавіце фактары размяшчэння вытворчасці. 3. Пералічыце асноўныя цэнтры металургічнай вытворчасці.

4. Дайце прагноз змены тэрытарыяльнай арганізацыі металургіі ў выніку будаўніцтва АЭС і распрацоўкі радовішчаў жалезных руд у Беларусі. 5. Пабудуйце і прааналізуйце дыяграмы, якія адлюстроўваюць дынаміку вытворчасці прадукцыі металургіі.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце завочную экскурсію «Прадпрыемствы металургіі Беларусі».

## § 34. Геаграфія машынабудавання

***Узгадваем.*** *Чаму машынабудаванне адносіцца да ключавых галін прамысловасці свету? Якую прадукцыю выпрабляе машынабудаванне? Якія падгаліны машынабудавання з'яўляюцца навукаёмістымі і інавацыйнымі?*

**Структура і фактары размяшчэння машынабудавання.** Машынабудаванне з'яўляецца галіной гаспадарчай спецыялізацыі Беларусі. На яго долю прыходзіцца звыш 15 % прадукцыі апрацоўчай прамысловасці краіны. Машынабудаванне Беларусі прадстаўлена рознымі падгалінамі (мал. 127). Галоўнымі фактарамі развіцця галіны ў краіне выступаюць выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча і наяўнасць высокакваліфікаваных працоўных рэсурсаў. Немалаважную ролю адыгрывае і спажывецкі фактар. Большасць прадпрыемстваў машынабудавання размешчана ў Мінску, на долю якіх прыходзіцца 1/3 прадукцыі машынабудавання краіны. Машынабудаўнічыя заводы сканцэнтраваны пераважна ў абласных цэнтрах і буйнейшых гарадах. Машынабудаўнічы комплекс краіны ўключае вытворчасць машын і абсталявання, транспартных сродкаў, электраабсталявання, бытавой тэхнікі, вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратуры. Ключавымі таварамі машынабудавання Беларусі з'яўляюцца грузавыя аўтамабілі, пагрузчыкі, кар'ерныя самазвалы, трактары, збожжаўборачныя і кормаўборачныя камбайны, халадзільнікі, мікрахвалевыя печы, электрычныя і газавыя пліты.